# Нас вырашылі зусім *звесці са свету*




Сведчанні жанчын пра гендарную дыскрымінацыю ў месцах несвабоды Беларусі

*У цемры наогул злачынства хаваецца лёгка,*
*Не заўважаць яго нават лягчэй.*
*У цемры няма вінаватых — якая палёгка!*
*Стогны бязвінных нібыта цішэй...*
*Вольна спявалі і нас пакаралі,*
*Нам спачувалі, але назіралі, але назіралі*
*Як нас ламалі, як мы сівелі,*
*Вы разумелі, але ўсё*
*глядзелі-глядзелі-глядзелі-глядзелі-глядзелі...*

радкі з песні гурта IRDORATH “Зорамі”,
якая была напісана ў жаночай калоніі
асуджанай на два гады зняволення
Надзеяй Калач

# Змест

Уступ . . . . . . . . . . 4

Міжнародныя стандарты ўтрымання зняволеных жанчын . . . . . . . . . . 5

Кантэкст і бягучая сітуацыя . . . . . . . . . . 9

Прыніжэнні, фізічныя і псіхалагічныя катаванні паводле гендарнай прыкметы, сэксуалізаваны гвалт . . . . . . . . . . 18

Як “выпраўляюць” жанчын у калоніях . . . . . . . . . . 44

Прыцягненне жанчын да цяжкай працы . . . . . . . . . . 54

Жаночае здароўе за кратамі . . . . . . . . . . 59

Псіхалагічныя праблемы . . . . . . . . . . 64

Разлучэнне маці і дзіцяці ў выніку палітычна матываванага пераследу . . . . . . . . . . 67

Высновы . . . . . . . . . . 71

# Уступ

Гэты агляд стаў вынікам збору і аналізу фактаў парушэння правоў жанчын на падставе гендарнай прыкметы ў месцах несвабоды, і ахоплівае перыяд з паслявыбарчых пратэстаў 2020 года да бесперапынных рэпрэсій ў 2024 годзе.

Мэта агляду — данесці да шырокай аўдыторыі інфармацыю пра тое, якія здзекі, бесчалавечнае абыходжанне, катаванні і нават гвалт зазнаюць жанчыны ў Беларусі ў XXI стагоддзі толькі таму, што адкрыта выказалі сваё меркаванне, супрацьпаставілі свае погляды дзеючаму таталітарнаму рэжыму, салідарызаваліся і падтрымлівалі тых, хто апынуўся ў зняволенні паводле палітычных матываў.

Асаблівасць гэтага агляду палягае ў тым, што ў большай ступені ён складаецца са сведчанняў тых, хто непасрэдна сутыкнуліся з рознымі формамі гендарнай дыскрымінацыі падчас затрыманняў, вобшукаў, арыштаў і крымінальнага пераследу.

Адмысловыя дакументальныя калажы паказваюць асабістыя перажыванні жанчын праз сімвалы, тэкстуры і метафарычныя элементы, ствараючы вобраз месцаў зняволенняў як іншай планеты са сваімі вычварэнскімі законамі і правіламі.
Гэты агляд стаў вынікам збору і аналізу фактаў парушэння правоў жанчын на падставе гендарнай прыкметы ў месцах несвабоды, і ахоплівае перыяд з паслявыбарчых пратэстаў 2020 года да бесперапынных рэпрэсій ў 2024 годзе.

# Міжнародныя стандарты ўтрымання зняволеных жанчын

Паняцце “дыскрымінацыя ў адносінах да жанчын” азначае любое адрозненне, выключэнне або абмежаванне паводле прыкметы полу, якое накіравана на паслабленне ці зводзіць на нішто прызнанне, карыстанне або ажыццяўленне жанчынамі, незалежна ад іх сямейнага становішча, на аснове раўнапраўя мужчын і жанчын, правоў чалавека і асноўных свабод у палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай, культурнай, грамадзянскай або любой іншай галіне. Гэта вызначэнне прыводзіцца ў якасці мэты Канвенцыі па ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын[1], аднак няма падстаў не ўжываць яго і ў іншых выпадках.

У адпаведнасці з Канвенцыяй, дзяржавы-ўдзельніцы павінны прымаць ва ўсіх галінах

“усе адпаведныя меры, уключаючы заканадаўчыя, дзеля забеспячэння ўсебаковага развіцця і прагрэсу жанчын, з тым каб гарантаваць ім ажыццяўленне і карыстанне правамі чалавека і асноўнымі свабодамі на аснове роўнасці з мужчынамі”.

У гэтым палажэнні закладзена важная ідэя: дзеля забеспячэння рэальнай роўнасці мужчын і жанчын правілы, якія рэгулююць грамадскія адносіны, у прыватнасці тыя, што тычацца жанчын-зняволеных, недастаткова зрабіць аднолькавымі для жанчын і мужчын — яны павінны быць шмат у чым рознымі, улічваць дадатковыя патрэбы і ўразлівае становішча жанчын.

Асноўным дакументам, які замацоўвае ўніверсальныя стандарты ў галіне пенітэнцыярных правілаў у адносінах да жанчын, з’яўляюцца Правілы Арганізацыі Аб’яднаных Нацый, якія датычацца абыходжання з жанчынамі-зняволенымі і мераў пакарання для жанчын-правапарушальніц, не звязаных з пазбаўленнем волі (Бангкокскія правілы)[2]. Адной з прычын яго стварэння стала недастатковае рэгуляванне становішча жанчын з улікам іх асаблівых патрэбаў і неабходнасці ўнясення большай яснасці ў пытанні абыходжання з імі. Характэрна, што Бангкокскія правілы ствараліся ў той час, калі дзейнічалі Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі 1955 года. У 2015 годзе гэтыя Мінімальныя правілы былі дапоўненыя і пашыраныя, аднак яны, вядомыя ўжо як правілы Нэльсана Мандэлы[3], па-ранейшаму не ў поўнай ступені адпавядаюць асабліваму месцу і ролі жанчыны ў грамадстве, яе патрэбам і інтарэсам. Да таго ж Мінімальныя правілы па-ранейшаму замацоўваюць шмат у чым заніжаныя стандарты з улікам разнастайнасці эканамічных магчымасцяў дзяржаў-удзельніц ААН.

1. https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/cedaw.shtml
2. https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/bangkok_rules.shtml
3. https://www.unodc.org/documents/justice-and-prison-reform/Nelson_Mandela_Rules-R-ebook.pdf

Бангкокскія правілы дастасавальныя да ўсіх катэгорый зняволеных — як тых, хто знаходзіцца пад следствам, так і тых, хто адбывае пакаранне. У кантэксце даследавання сітуацыі ў Беларусі для ўжывання Правілаў усё роўна, у якім працэсе (адміністрацыйным або крымінальным) прызначанае і як называецца пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі.

Бангкокскія правілы і Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын з усёй відавочнасцю не ўлічваюцца ў Беларусі на заканадаўчым і правапрымяняльным узроўнях. Дастаткова адзначыць, што заканадаўства Рэспублікі Беларусь не ўтрымлівае ўсёабдымнага вызначэння дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын. Гэта можа быць першапрычынай адсутнасці гарантый супраць дыскрымінацыі.

Так, у дзявятым перыядычным дакладзе Рэспублікі Беларусь у Камітэт ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын адзначана, што “нацыянальнае заканадаўства дыскрымінацыйна нейтральнае, паколькі не замацоўвае неапраўданыя перавагі групы людзей у залежнасці ад полу”. Змест дакладу дае добрае ўяўленне адносна таго, наколькі гендарныя адрозненні, уразлівасці і патрэбы ігнаруюцца дзяржавай на бягучым этапе.

У раздзеле “Жанчыны ў зняволенні” дзяржава справаздачыцца аб выкананні Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх формаў дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын і спасылаецца на розныя крымінальна-выканаўчыя нормы, унесеныя ў іх у справаздачным перыядзе змены і прызнае, што “на ўтрыманне жанчын-зняволеных, у прыватнасці жанчын-інвалідаў, названыя змены распаўсюджваюцца на агульных падставах”. Характэрны той факт, што становішча жанчын-зняволеных не прадстаўлена ў іншых раздзелах дакладу.

Гэта закладвае аснову для таго, каб дапускаць і заахвочваць на дзяржаўным узроўні асабліва цяжкія ўмовы для жанчын, асабліва жанчын-палітзняволеных падчас знаходжання ва ўстановах несвабоды.

# Кантэкст і бягучая сітуацыя

Першыя акцыі пратэсту (не ў межах перадвыбарчых пікетаў, калі таксама адбываліся затрыманні) адбыліся *14 ліпеня 2020 года* — у дзень, калі Цэнтральная выбарчая камісія Беларусі рэгістравала кандыдатаў у прэзідэнты і не зацвердзіла такімі Віктара Бабарыку, які ў той момант амаль месяц як знаходзіўся ў СІЗА, і Валерыя Цапкалу.

У той дзень па краіне было затрымана 415 мужчын і 21 жанчына, але інфармацыя ёсць толькі пра два штрафы ў дачыненні да апошніх.

415

21

# Вялікая хваля затрыманняў па ўсёй краіне адбылася 9 жніўня 2020 года.

Тады было затрымана як мінімум 3 630 чалавек, з іх не менш за 250 жанчын. Пры гэтым, згодна са звесткамі праваабаронцаў, 64 жанчыны былі асуджаныя да арышту, 16 — да штрафу. Затрыманні працягнуліся 10 і 11 жніўня, праваабаронцам было вядома пра 91 і 80 затрыманых жанчын у гэтыя дні адпаведна.



Штотыднёвыя суботнія жаночыя маршы[4] пацягнулі за сабой і больш жорсткае стаўленне да іх удзельніц: масавыя затрыманні адбываліся 12, 19, 26 верасня, 26 кастрычніка, 7 і 13 лістапада. Найбольшая колькасць жанчын была затрыманая 19 верасня 2020 года — амаль 400 чалавек па ўсёй краіне (з іх толькі 45 мужчын). Большасць з затрыманых былі асуджаныя ў адміністрацыйным парадку да штрафаў. Вядома толькі пра 15 выпадкаў адміністрацыйных арыштаў жанчын.




Для параўнання: 47 з 104 затрыманых 12 верасня былі кінутыя на "суткі", яшчэ 15 атрымалі штрафы.




(4) Жаночыя маршы — масавыя акцыі салідарнасці жанчын, якія праходзілі ў Мінску штосуботу з 29 жніўня па 19 снежня 2020 года ў знак пратэсту супраць жорсткіх рэпрэсій з боку сілавікоў.

І калі ў пачатку пратэстаў 2020 года назіралася тэндэнцыя, што жанчын затрымліваюць і пераследуюць меней за мужчын, то з цягам часу гэта змянілася — распачаўся жорсткі гвалт і здзекі з жанчын на розных узроўнях.

Што тычыцца палітзняволеных жанчын, то іх колькасць за гэтыя гады была рознай, аднак у сярэднім складае 10-12% ад агульнай лічбы палітвязняў (згодна са звесткамі на 1 сакавіка 2025 г., у Беларусі налічваецца 154 палітзняволеных жанчын).

10-12%

За перыяд 2020-2024 гг. палітычна матываваны крымінальны пераслед спазналі не менш за 1 562 жанчыны.

З іх да пазбаўлення волі ў калоніі асудзілі мінімум 348 жанчын, да абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу — 73.

348

73

1562

634

Да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову былі асуджаныя 634 жанчыны. Вынікі астатніх прысудаў праваабаронцам невядомыя, бо ўлады прыкладаюць ўсе магчымыя высілкі, каб схаваць рэальныя маштабы рэпрэсій.

Больш за ўсё жанчын пераследуюць за ўдзел у паслявыбарчых акцыях пратэсту ў 2020 годзе — паводле арт. 293, 342, 363 і 364 Крымінальнага кодэкса асудзілі не менш за 993 жанчыны.

993

592

За каментары ў інтэрнэце асудзілі мінімум 592 жанчыны (паводле арт. 368 “Абраза прэзідэнта”, арт. 369 “Абраза прадстаўніка ўлады”, арт. 188 “Паклёп”, арт. 367 “Паклёп на прэзідэнта”, арт. 391 “Абраза суддзі”, арт. 130 “Распальванне іншай сацыяльнай варожасці”).

# Асаблівыя патрэбы жанчын і ўмовы ўтрымання

Да ***асаблівых патрэбаў*** жанчын у першую чаргу адносіцца доступ да медыцынскай дапамогі (гінекалагічныя агляды, дагляд падчас цяжарнасці і родаў, падтрымка ў выпадках хранічных захворванняў), захаванне рэпрадуктыўнага здароўя, забеспячэнне сродкамі асабістай гігіены (пракладкі, мыла і іншыя сродкі першай неабходнасці), абарона ад гвалту, дамаганняў і дыскрымінацыі з боку персаналу і іншых зняволеных, псіхалагічная падтрымка і захаванне сувязяў з сям'ёй, у першую чаргу з непаўнагадовымі дзецьмі.

У прыватнасці, ААН рэкамендуе прымяняць меры, не звязаныя са зняволеннем, асабліва для жанчын з дзецьмі, цяжарных і тых, хто здзейсніў негвалтоўныя злачынствы. Грамадства ўладкавана такім чынам, што менавіта жанчына вельмі часта з'яўляецца той, на чые плечы кладзецца асноўны клопат пра сям'ю. Таму раптоўныя змены, звязаныя з пазбаўленнем свабоды і ізаляцыяй ад блізкіх, вельмі неспрыяльна адбіваецца на псіхіцы жанчыны.

Бесперашкодны доступ да санітарных рэчаў і прыстасаванняў для мыцця, таксама забеспячэнне прадметамі асабістай гігіены, такімі як гігіенічныя пракладкі і тампоны, з'яўляюцца пытаннямі асаблівай важнасці. Незабеспячэнне гэтых асноўных патрэбаў само па сабе можа разглядацца як абыходжанне, якое прыніжае чалавечую годнасць.

Згодна з Бангкокскімі правіламі, павінны прымацца эфектыўныя меры дзеля забеспячэння паважлівага стаўлення да жанчын-зняволеных і абароны іх годнасці падчас асабістых вобшукаў, якія праводзяцца толькі жаночым персаналам, што прайшоў належную падрыхтоўку паводле адпаведных метадаў правядзення вобшукаў, і ў адпаведнасці з вызначаным парадкам (Правіла 19).

Акрамя таго, павінны распрацоўвацца і ажыццяўляцца выразныя прынцыпы і правілы ў дачыненні да паводзін персаналу папраўчых устаноў, накіраваныя на забеспячэнне максімальнай абароны жанчын-зняволеных ад любога гвалту, абраз і сэксуалізаваных дамаганняў паводле гендарнай прыкметы ў фізічнай або славеснай форме (Правіла 31).

Аднак улады ў Беларусі наўмысна робяць усё, каб абмежаваць жанчын у самым неабходным, прынесці дадатковыя пакуты і пакаранне праз стварэнне невыносных умоваў утрымання, у прыватнасці падчас затрымання, адміністрацыйнага арышту і адбывання пакарання ў папраўчых калоніях.

Ніжэй мы прыводзім сведчанні жанчын, якія прайшлі зняволенне і спазналі дыскрымінацыю паводле гендарнай прыкметы.

# Прыніжэнні, фізічныя і псіхалагічныя катаванні паводле гендарнай прыкметы, сэксуалізаваны гвалт

Шмат жанчын сведчылі пра жорсткае абыходжанне, здзекі, абразы і пагрозы ў свой адрас, у тым ліку сэксуальным дамаганнем і гвалтам, з якімі сутыкаліся ад самога моманту затрымання.

Сілавікі не саромеліся ў сваіх выказваннях: ***“с*ка”, “шл*ха”, “бл*дь”...*** — затрыманыя неаднойчы чулі падобныя словы.

І ён [супрацоўнік УУС] проста паставіў мяне каля сцяны і як стаў мне гарлапаніць на вуха, што мая праца — *гэта смактаць ў мужыкоў.* Разумееце, я стаю, мяне проста паліваюць брудам, што такіх, як я, трэба забіваць, што я нявартая наогул жыць, і пайшло і паехала, што я *бэчэбэшная с*ка*, вось у такім вось родзе, разумееце?

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

Карацей, яны крычалі, там, вядома, былі абразы: што я *дура*, што я *мазахістка*...

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

Усе вось гэтыя ахоўнікі і хто дзяжурылі — гэта былі амапаўцы. І яны былі вельмі злыя, таму што яны ўвесь час таксама пагражалі, абражалі, пагражалі кінуць гранату ў бокс. Казалі: “Мы вас *можам забіць, згвалціць.* Нам за гэта нічога не будзе”.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

Гэта пастаянныя абразы — *“цёлкі”*. Ну і нам казалі *“каровы”* там ці нешта ў гэтым родзе.

— сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Скрашчук

Абразы могуць быць не толькі славеснымі, але і прымаць форму дзеяння, што ўключае частыя і нематываваныя асабістыя дагляды, а таксама непрыстойныя дотыкі падчас іх, падглядванне за жанчынамі ў душы і жылых памяшканнях.

І апошняй кропелькай, вось вішанькай на торце было зняць майткі і прысесці пяць разоў. І я на яе такая, я кажу:

— Выбачайце, у мяне месячныя.

— *Мяне не я*уць твае месячныя*, як бы не хвалююць. Зняць майткі і прысесці.

— сведчанні Фацімы Камары, ІЧУ на Акрэсціна




Табе кажуць: *“Ідзі ў душавую”.* Там так напісана: “Душавая”. І там сапраўды ёсць два душы ў гэтым памяшканні, але, шчыра сказаць, я не ведаю, як бы палітычных не водзяць нікуды, таму не ведаю.

Але ты туды заходзіш, каб твае рэчы даглядзелі. Гэта значыць, ты калі паступаеш і калі цябе выпускаюць, ты заходзіш у гэтую душавую.

І ён кажа: *“Распранайся, пакідай усе рэчы на лаўцы і заходзь у душ”.*

Я павінна была стаяць там **голая**, а ён пакуль там аглядаў мае рэчы. Ён не бачыў мяне ў гэты момант. Там ёсць камера, калі ты распранаешся. І, шчыра сказаць, ты на такія дробязі там ужо ўвагі не звяртаеш.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

Нас два разы адводзілі ў душ. І я памятаю, што, ну як бы ён агульны, гэты душ быў, там як бы ўсе распранаюцца, усе разам займаюцца гэтымі справамі. І яны [наглядчыкі-мужчыны] чамусьці адкрылі [акенца], мы ўзялі з сабой лісцік, каб закрыць як бы гэта акенца, таму што мы не ведалі, будуць яны там глядзець ці не. Я не памятаю, ці была фізічная нейкая магчымасць закрыць гэтую штуку, але я памятаю, мы самі ўзялі, каб закрыць, каб не было відаць, ну гэта значыць, хоць нейкую прыватнасць мець у гэтым месцы [у душы].

І я памятаю, што дзяўчынкі лаяліся з нагоды таго, што там нейкая дзірка застаецца, і яны [наглядчыкі-мужчыны] там нешта нейкія жарты адпускалі, тыпу:

*“Вы думаеце, так мы вас згвалцім?”*

Ці яны адпускалі такія жарты пра згвалтаванні, і гэта было тыпу смешна з іх боку. А мы знаходзіліся як бы за кратамі, і мы не можам сказаць, яны жартуюць ці не.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

Рукамыйніцы яны вынеслі асобна і паставілі туды *камеры відэаназірання.* А нам жа трэба было неяк мыцца, таму даводзілася голымі пад гэтымі камерамі ўсё рабіць. І калі разумееш, што *на твае голыя грудзі глядзяць мужчыны*, то гэта вельмі непрыемна, мякка кажучы. Але ад гэтага нікуды не схавацца. І ў прыбіральні таксама перасталі дзверы зачыняцца.

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці, Следчая турма № 8

Таксама супрацоўнікі міліцыі і іншых сілавых ведамстваў могуць разглядаць жанчын як патэнцыйныя аб’екты, дзеля задавальнення сваіх сэксуальных фантазій.

Яны мяне не білі кулакамі. Пляснулі па задніцы. Усё гэта суправаджалася пагрозамі *групавога згвалтавання*. Ва ўсіх фарбах апісвалі, што будзе, калі не здам ўсе паролі. Майку задзіралі. Адзін задзірае, а другі здымае на тэлефон. Гэта так зневажальна.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці [Медыязона, 2024]

Быў той момант, калі я пачала перажываць праз магчымасць нейкага *сэксуальнага гвалту*. Таму што яны пачалі звяртаць увагу на маю знешнасць, я ім спадабалася [...] Я была ў зімовай куртцы белай, з мехам, у мяне была байка зялёная, цёплая, ну джынсы і красоўкі, і вось я так сяджу, і да мяне выходзіць адзін супрацоўнік, заходзяць двое, і так вось зазіраюць: *“А, ну нічо такая. А што ты...”* [...]
Вось, і адзін такі, вось так вось зазірае, на мой твар глядзіць: а, лепш бы ты, — тыпу, — са мной была, там, чым на вось гэтыя вось усе мітынгі хадзіла.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

Спыталі пра хлопца. Я сказала: “Так, хлопец ёсць”. — “Як завуць?” Я кажу: “Саша”. — “Чым займаецца?” Я кажу: “Саша, ну тыпу, айцішнік”.

Чалавек, які на мяне крычаў і сядзеў у машыне пры затрыманні злева ад мяне, і ён жа ў кабінеце сядзеў далей. Вось, ён там сядзіць і кажа, такі, гэта цытата: *“Будзеш не свайму Сашу х*й смактаць, а бабам п*зды лізаць у Гомелі”.*

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

[Супрацоўнік] там прамым тэкстам сказаў: “Можаш паехаць вось *пазабаўляцца.* Калі хочаш, мы можам заехаць да яе туды дадому, і ты вось пазабаўляешся. Калі хочаш”.

Я думаю, што пад забаўкай яны мелі на ўвазе, нават не ведаю, як гэта прамаўляць, таму што мне брыдка. Вось. Але тое, што ён [супрацоўнік] мяне *можа выкарыстаць па сваім меркаванні,* аж да таго, што там, ну нейкія сэксуальныя адносіны.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

І пакуль мы ішлі [з камеры да выхаду], гэта ўсё суправаджалася такімі каментарамі: “Вось, а ты ж не ведаеш, куды я цябе вязу. Вось я зараз цябе там вось *завязу і тр*хну.* І ты наогул нічога не дакажаш”. Вось. “А што ў цябе за наколкі? А я вось хачу паглядзець”.

Я на гэта наогул ніяк не рэагавала. Думаю, ты можаш казаць наогул усё што заўгодна. Я буду вось на гэты момант, я буду проста маўчаць, каб там не справакаваць нічога.

Калі мы ўжо прыйшлі да КПП, там ужо былі іншыя супрацоўнікі, і ён змоўк.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, СІЗА г. Віцебска

Сілавікі нярэдка выказвалі зняволеным жанчынам пагрозы адносна **сэксуалізаванага групавога згвалтавання:**

> І яны там усе стаяць і пачынаюць з мяне, ну не тое каб здзекавацца, пачынаюць проста казаць абразы, ну ў плане там *“шл*ха”, “мы цябе пусцім па крузе”.*
>
> Карацей, мне далі гэты пратакол. Я падпісала, натуральна, таму што там стаіць цэлая куча мужыкоў, якія мне там пачынаюць нейкую лухту казаць, і я не ведаю, што са мной можа быць у гэтым закрытым памяшканні, *мне ніхто не дапаможа.*
>
> — сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

Сам факт таго, што затрымліваюць і вядуць допыт звычайна мужчыны, можа напалохаць жанчын. Больш за тое, боязь сэксуалізаваных дамаганняў, пагрозы сэксуалізаваным гвалтам, а таксама жорсткае абыходжанне і катаванні прыводзяць да таго, што **жанчыны могуць прызнавацца ў злачынствах, якія яны не здзяйснялі.**

У мяне шмат праколаў з завушніцамі ў вушах, на гэта сілавік сказаў: “Здымай гэтыя ўсе цацкі”. Калі я здымала іх, то ён мне сказаў: “І з майткоў таксама даставай, а то мы потым знойдзем”. Я праз тое, што была ў стрэсе, не зразумела, што яны падазраюць інтымны пірсінг, якога ў мяне насамрэч няма. Я тады падумала, што мне фізічна паграджаюць і сказала: *“Вы што, і ў майткі мне будзеце лезці?”*

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

І для мяне самым вялікім страхам было, напэўна, не фізічны гвалт, а сэксуальны. Гэта значыць, фізічны гвалт, ну як бы, зразумела, *балюча,* зразумела, *страшна,* зразумела, *крыўдна.* Але гэта неяк переажыць можа. А сэксуальных ўсіх вось гэтых момантаў я баялася вельмі моцна. І вось тады мяне паставілі да сценкі, рукі наверх, і атрымліваецца так, што ў цябе спіна, як бы, прагнутая, ты ў такой трошачкі позе, атрымліваецца, стаіш. І я памятаю, як усе тры супрацоўнікі міліцыі стаялі ў мяне за спінай, абмяркоўвалі, колькі мне гадоў, і што *я ў іх гусце*, і што, ну ўсякае, такога, трошачкі сэксуальнага характару было абмеркаванне, проста за маёй спінай, я іх адчувала. І мне было *вельмі непрыемна і страшна*.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці

Жорсткае і бесчалавечнае абыходжанне працягваецца ў ізалятарах часовага ўтрымання, дзе ствараюцца невыносныя ўмовы для затрыманых паводле палітычных матываў. Перапоўненыя камеры, антысанітарыя, адсутнасць вентыляцыі, матрасаў і пасцельнай бялізны, кругласутквава ўключанае штучнае святло — тая рэчаіснасць, праз якую прайшлі тысячы жанчын у розных кутках Беларусі.

Мяне папярэджвалі, што ў камеры будзе горача і душна, але я не думала, што настолькі. Я зайшла нібыта ў парылку ў лазні. Ты заходзіш, а на цябе — хваля поту і спякоты. Там стаіць тэмпература дзесьці каля +36-40 градусаў. Памяшканне наогул не праветрываецца, вентылятар не ўключаецца зусім, “кармушку” не адчыняюць. [...] Быў дзень, калі я ўжо ў думках развіталася з усімі роднымі, бо думала, што памру. Тады ў камеры нас было 18 чалавек, і мы сталі выключацца ад недахопу паветра. У нас кандэнсат сцякаў па сценках.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ЦІП на Акрэсціна, 2022 г.

Мы спалі па двое, але асобныя ложкі выдзелілі дзвюм жанчынам, у якіх былі праблемы са здароўем. 48 дзён у нашай камеры не выключалася святло наогул. Тры тыдні *нас не выводзілі мыцца і на прагулкі, мы былі без зубных шчотак, паст і іншых сродкаў гігіены.* Сваякі прыязджалі, спрабавалі перадаць нешта, але ў іх нічога не прымалі.

— сведчанні затрыманай па “справе Зельцэра”, Следчая турма г. Жодзіна, 2021 г.

А 22-й гадзіне быў адбой, але нас падымалі потым апоўначы, а другой гадзіне ночы, а пад'ём быў а шостай гадзіне. Усю ноч трэба было хадзіць да "кармушкі" [маленькае вакно для падачы ежы ў дзвярах камеры], называць сваё прозвішча і свой прафілактычны ўлік, хоць на яго нас яшчэ не паставілі. [...]

Адзення зменнага ў нас не было ніякага, таму мы ў майтках, майках, staніках хадзілі да гэтай "кармушкі", дзе на нас глядзелі супрацоўнікі. І такім гуськом мы паўночы вакол стала хадзілі. Хтосьці быў заматаны ў прасціны, а хтосьці і так. Супрацоўнікі нам казалі: "Навошта вам перадачы? Вы атрымліваеце тут трохразовае гарачае харчаванне".

Кожны дзень нас выводзілі на пастраенні ля сценкі на расцяжцы. Супрацоўнікі *білі пад каленкамі палкай або нагой* пастаянна, каб мы ніжэй схіляліся, а ахоўніцы палкай ногі рассоўвалі шырэй. Неяк нас пасадзілі на кукішкі, уключаючы сталых людзей, якім пад 70 гадоў. *Людзі падалі на падлогу і плакалі.* Калі мы вярнуліся ў камеру, хтосьці нават страціў прытомнасць. Больш яны нас не саджалі на кукішкі. Але здзекаваліся па-іншаму ўсяляк.

— сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Скрашчук,
Следчая турма г. Жодзіна, 2021 г.

Сітуацыі значна пагоршылася з 2021 года, калі перадачы ад родных зусім перасталі прымаць, а размяшчэнне па камерах стала перавышаць усе магчымыя нормы. Больш за тое, затрыманым *забараняюць браць у камеру сродкі асабістай гігіены* (пракладкі, мыла, зубную шчотку і пасту), цёплае адзенне і зменную бялізну нават тады, калі яны змаглі захапіць гэта з дому.

У мяне забралі ўсё, я кажу:

— У мяне ў рэчах ёсць зубная шчотка, і шкарпэткі, і сродкі гігіены, так? У мяне там былі пракладкі і тампоны. Магу ўзяць?

— Не належыць.

— сведчанні Фацімы Камары, ІЧУ на Акрэсціна

Гэта азначае, што жанчын наўпрост **пазбавілі сродкаў першай гігіены,** яны вымушаныя спаць на халоднай падлозе, але пры гэтым іх двойчы за ноч вымушаюць паднімацца і называць сваё імя і прозвішча. Праз гэта ў некаторых затрыманых з'яўляліся ці абвастраліся захворванні, у тым ліку органаў малага таза.

У мяне пачаўся цыстыт, таму што я спала на падлозе. Дзяўчынкі скардзіліся медсястры на ўкусы [блашчыц], на што яна адказвала: *"Таму што вы не мыецеся, прыходзіце брудныя, і нас усіх тут заражаеце".*

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці,
ІЧУ на Акрэсціна, 2022 г.

Калі мы прыехалі, то ўсе моцна захварэлі. У нас знік пах — тады быў самы разгар кавіду. На Акрэсціна мы спалі на падлозе, таму захварэлі на ангіну, у нас у многіх апухла горла і была тэмпература. Медыцынская дапамога нам не аказвалася. Прыходзіў начальнік і казаў: *"Вы дрэнныя людзі, лекаў вам не дам".*

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці,
ІЧУ на Акрэсціна, 2021 г.

Гэта было страшна. Было жудасна холадна. [...] Мы ўсе спалі на падлозе. Матрацы, зразумела, не выдавалі. Мы рабілі падушкі з хлеба, але ён крышыўся, таму дапамагала не вельмі. Праверкі а другой і чацвёртай ночы — стандарт. Вакол усё бруднае. І ў дадатак да ўсяго, каб нашкодзіць, супрацоўнікі *адключалі нам гарачую ваду.* Наколькі я зразумела, яны гэта могуць рабіць па камерах. [...] Кожную раніцу начальнік асабіста прыходзіў на праверку: абражаў, адчытваў — жасціў, увогуле. На кожнай праверцы ў нас забіралі хоць што-небудзь — нават кавалачак туалетнай паперы, які самі і далі.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ІЧУ на Акрэсціна, 2024 г.

Амаль ва ўсіх жанчын там, ужо праз там нейкі час, можа праз тыдзень-два, *усе месячныя зніклі.* У мяне менструацыі зніклі на месяцы тры, напэўна. Пасля каранціну я сабе застудзіла, за кошт таго, што нас трымалі на рашотках, застудзіла сабе яечнікі. У мяне пачаў вельмі моцна балець бок правы, у мяне былі праблемы з яечнікам і да гэтага. Пагоршыліся.

— сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Скрашчук, Следчая турма г. Жодзіна, 2021 г.

За час адміністрацыйнага арышту — 10, 15 і больш сутак — жанчын не выводзяць на прагулкі і не водзяць у душ, яны ўвесь час знаходзяцца ў маленькіх перапоўненых камерах, дзе змяшчаецца непасрэдна прыбіральня, а туалетную паперу, мыла ды пракладкі жанчыны вымушаныя выпрошваць у ахоўнікаў, большасць з якіх — мужчыны.

*Мы прасілі даць нам пракладкі, але нам не давалі.* Калі мы прыехалі з Акрэсціна, то ў нас яшчэ былі месячныя, а потым яны зніклі дзесьці месяцы на тры ад стрэсу. Таксама не выдавалі нам і туалетную паперу. Калі давалі трохі і мы прасілі зноў, то супрацоўнікі пыталіся: *“Што вы сабе там усё траце?”* Былі ўсялякія прыніжэнні.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ІЧУ на Акрэсціна, 2021 г.

Туалетную паперу нам выдавалі адзін раз на некалькі дзён, а ў камеры нас было 12-13 чалавек і яе не хапала. І было, калі нам не выдавалі на працягу трох дзён пасля яе заканчэння. Нам было сказана, што ў нас на суткі павінна быць *80 см на чалавека,* і мы тры дні былі без яе. Нам выдавалі мыла гаспадарчае, хтосьці нават ім спрабаваў мыць галаву. Але насамрэч ад яго станавілася горш, галава бруднілася, а валасы былі як салома”.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ЦІП на Акрэсціна, 2023 г.

У камеры старога будынку ІЧУ было вельмі вільготна. Калі заходзіш туды, першае, што заўважаеш, — вельмі моцны пах. Там вельмі *моцна смярдзела* і туалетам, і потам. Цвіль была на сценах і на століі, і нават акно было пакрыта вялікімі кроплямі вады. А гэта быў студзень, памяшканне ацяплялася і быў кандэнсат.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ІЧУ г. Віцебск, 2024 г.

Самае вострае пытанне ў зняволенні — гігіена. Для мяне як для чалавека, які ў душ ходзіць кожны дзень, не мыцца два тыдні — ужо занадта. Адзінае, добра, што заставаліся пластыкавыя бутэлькі ад іншых людзей. У іх мы набіралі ваду і мыліся. Але на адной з праверак пад кіраўніцтвам начальніка ўсе бутэлькі забралі. *А ў двухмеснай камеры — 14 жанчын!* Як нам усім падтрымліваць хоць мінімальную гігіену? Для жанчыны гэта неабходна. Выпадковым чынам у нас апынуўся пакет з-пад пракладак. І вось усе 14 жанчын па чарзе набіралі ваду ў пакет з-пад пракладак і так мыліся.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ІЧУ на Акрэсціна, 2024 г.

**Адсутнасць гігіенічных сродкаў —** у першую чаргу пракладак і тампонаў — не толькі цягне за сабой немагчымасць прытрымлівацца асабістай гігіены, але і прыніжае годнасць, выклікае фізічныя і маральныя пакуты.

А яшчэ атрымліваецца, калі я прыехала на ІЧУ, у мяне пачаліся месячныя. Я папрасіла ў іх пракладку. А гэта на наступны дзень, на раніцу, атрымліваецца, быў абход, і я папрасіла. Яны сказалі: “Ну добра, мы медсястры перадамо, яна вам прынясе”. У выніку я прачакала гадзіну, дзве — няма. Я пачала зноў грукацца, прасіць, яны такія: “Добра, мы нагадаем”. Потым, у выніку, яшчэ, напэўна, праз гадзіну прыйшла медсястра, сказала, што *пракладак няма,* і прынесла мне нейкія *кавалкі ваты,* г. зн. яна дзесьці іх нарвала нейкімі такімі кавалкамі і так мне гэтую кучу, тыпу: на, усё што ёсць.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці,
ЦІП на Акрэсціна

І ў адной з іх [затрыманых], скажам так, раней за час пачаліся месячныя, яны ў яе вельмі моцныя былі... Ёй патрэбна была пракладка ў гадзіну, ну ўмоўна, у яе проста па нагах цякло. І ёй не давалі пракладак, яна там спрабавала — у яе там была ніжняя такая сукенка, як сарочка — падкладаць пад сябе, гэта значыць, ну проста было ўсё вельмі дрэнна. І ў нейкі дзень мы вырашылі, каб яна проста прайшла – там з раніцы ідзе агляд камеры, і мы выходзім у калідор літаральна на пару хвілін — і мы ёй сказалі, каб яна нічога не падкладала. *І яна прайшлася і заліла крывёю ўвесь калідор ім. І толькі пасля гэтага нам далі пачак пракладак, вось. [...]*

Ну яны былі ў шоку, з улікам таго, што там адны мужчыны ў асноўным, яны вельмі моцна перапалохаліся. Да іх не даходзіць, што такое месячныя, што такое пракладкі, колькі іх трэба і ўсё астатняе.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці,
ЦІП на Акрэсціна



Пракладак, яны сказалі, няма, ігнаравалі. І гэтай дзяўчынцы прыйшлося проста *парваць майку сваю і рабіць з гэтага пракладкі.* Прычым яна гэтыя анучкі потым яшчэ мыла ў халоднай вадзе, сушыла і далей іх выкарыстала як пракладкі.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці,
ІЧУ г. Магілёў

Аднойчы праз стрэс ва ўсіх жанчын у камеры ў адзін дзень пачалася менструацыя. Але супрацоўнікі ізалятара не выдалі нам *ніводнай пракладкі.*

— сведчанні Наталлі Кукішавай, ІЧУ на Акрэсціна,
2021 г.

Праблема, вядома, для ўсіх дзяўчын была з пракладкамі. Іх можна прасіць толькі ў медыцынскага супрацоўніка. Адна дзяўчына, таксама асуджаная паводле палітычных матываў, *баялася прасіць пракладкі.* А яны ўвогуле могуць даць толькі адну на дзень. Бывае, што шанцуе і даюць больш, але звычайна па адной. Гэтай дзяўчыне не давалі, таму яна падчас месячных *карысталася нейкай анучай,* якую потым мыла ў халоднай вадзе і сушыла.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ІЧУ г. Віцебск, 2024 г.

Нягледзячы на тое, што лекі яшчэ прымаюць для арыштаваных у адміністрацыйным парадку, атрымаць іх наўпрост немагчыма, бо для гэтага трэба паклікаць “лекара”, які ўвесь час “заняты”. А калі жанчыны нарэшце гэтага дамагаліся, то атрымаць патрэбную таблетку ў неабходнай колькасці было дадатковым **непераадольным выклікам.**

Камера была двухмесная, але нас там было ад шасці да васьмі асобаў. Ноччу было занадта халодна, на вуліцы снежань месяц. *Бялізну і матрасы не выдавалі.* Да нас на пару дзён падсаджвалі бяздомную. Але я лекарка і ў мяне высокі парог чуллівасці. У пэўны момант амаль уся камера захварэла. Лекі амаль не давалі, ібупрафен ці парацэтамол прыйшлося ледзь не выпрошваць. Мая каляжанка патрапіла ў ізалятар разам з мужам, які хварэе на бранхіяльную астму. Сілавікі дазволілі яму ўзяць з дому *лекі, якія затым у камеру так і не перадалі.*

— сведчанні хірургіні на ўмовах ананімнасці, ІЧУ на Акрэсціна, 2022 г.



Гэта было жудасна. З намі былі жанчыны, каму ўжо 60 гадоў, жанчыны з вельмі сур'ёзнымі захворваннямі. Памятаю сваю сукамерніцу — жанчыну з анеўрызмай галаўнога мозгу. *Медыцынскую дапамогу там атрымаць нерэальна.* Максімум — можна было дамагчыся таблеткі ад фельчаркі, калі яна баялася, што чалавек памерці можа. Але суправаджалася гэта трохпавярховым матам.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ІЧУ на Акрэсціна, 2024 г.

> У адной сукамерніцы было *падазрэнне на рак.* Яе затрымалі ў дзень біяпсіі, і ў яе з сабой была куча таблетак. Але на Акрэсціна не даюць шмат таблетак, каб ты не ўчыніў суіцыд там. Калі змянялася змена, то кожны раз пачынаўся на гэтую дзяўчынку крык. Яны крычалі, якая яна поскудзь і збіраецца забіцца на іх змене. Кожны раз даводзілася даказваць, што ў яе ўсё па пратаколе.
>
> — сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці, ІЧУ на Акрэсціна, 2022 г.

Змяшчэнне разам з арыштаванымі жанчынамі бяздомных людзей, якія церпяць ад захворванняў і маюць вошай, — адмысловая тактыка рэжыму. Яна стала прымяняецца, каб зрабіць ўмовы арышту **яшчэ больш невыноснымі,** фактычна наўмысна заразіць зняволеных. Акрамя таго, у камерах ёсць блашчыцы, макрыцы ды інш.

> У камеру падсялялі бамжоў — гэта маргіналы, ад якіх смярдзіць, адмыць іх на Акрэсціна, дзе адзін кавалак гаспадарчага мыла на ўсіх і адна ракавіна, немагчыма. *Усе падхапілі вошай,* пазбавіцца ад якіх было амаль немагчыма. Матрацаў не было — спалі на падлозе з блашчыцамі. [...] Пазней у нас з'явіліся *бялізнавыя вошы.* Тады мы пачалі некалькі разоў на дзень правяраць рэчы, душыць іх. Прыбраць у камеры было няма чым — дапрасіцца хлёркі было немагчыма, пры гэтым нам пагражалі, што зальюць ёю падлогу.
>
> — сведчанні былой палітзняволенай Асі Булыбенкі, ЦІП на Акрэсціна [Салідарнасць, 2023]

На Жодзіна медыцынскія работнікі не займаюцца першаснай апрацоўкай людзей пры паступленні. Да нас падсаджвалі *жанчын з сухотамі і з вошамі, гепатытам С і ВІЧ.* Часам не давалі сродкі ад вошай. Таму дзяўчынкі прасілі блізкіх перадаць шампуні і спецыяльныя расчоскі, каб вычэсваць гнідаў. Дзяўчынкі-сукамерніцы надзявалі пальчаткі і апрацоўвалі такіх жанчын самі. На праверках мы задавалі пытанні, чаму ў нашых камерах знаходзяцца ВІЧ-інфікаваныя і яны не праходзяць тэрапію.

— сведчанні затрыманай па “справе Зельцэра”,
Следчая турма г. Жодзіна, 2021 г.

Спаць там немагчыма было, таму што кладзешся, расплюшчваеш вочы, а там *блашчыца ці макрыца паўзе.* У некаторых была алергія на ўкусы і яны пакрываліся чырвонымі плямамі.

— сведчанні расійскай журналісткі Кацярыны Яньшынай,
ЦІП на Акрэсціна, 2023 г.

Мяне папярэдзілі, што ў камеры шмат блашчыц, а потым я і сама іх убачыла — бэжавая сцяна ўся была *ў чырвоных падцёках у крыві,* як быццам там забівалі кагосьці. Я адразу ўбачыла маленькіх блашчыц, а потым убачыла іх памерам з пазногаць. Можна было прачнуцца сярод ночы, а на руцэ сядзіць пяць штук. Добра, што ў мяне няма алергіі на іх укусы, як у некаторых. У мяне былі ўкусы, як ад камароў, а ў некаторых дзяўчынак укусы блашчыц зліліся ў адзін велізарны ўкус і твар рабіўся круглым.

— сведчанні праграмісткі на ўмовах ананімнасці,
ЦІП на Акрэсціна, 2023 г.

Два разы ў нашай камеры труцілі блашчыц — на гэты час нас пераводзілі ў іншую камеру. Але калі мы вярталіся, у камеры было столькі блашчыц, колькі і было, таму што яны там не ў адной камеры — гэта ўсё нашмат больш сур'ёзна. Таму гэта была "птушка", што мы, маўляў, усё зрабілі, а вы ўсё абураецеся. Потым яны пачалі казаць, што ніякіх блашчыц няма, а мы ўсё выдумляем. Тады мы пачалі збіраць іх на паперку і пачалі ім падсоўваць у "кармушку", а яны казалі: *"Прыбярыце гэтую брыдоту, самі з гэтым жывіце".*

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці,
ІЧУ на Акрэсціна, 2022 г.

Яшчэ адзін з відаў прыніжэння для жанчын — "голы" дагляд, які ўключае ў сябе частковае або поўнае зняцце адзення для візуальнага агляду ўсіх частак цела, пры гэтым ад зняволеных могуць патрабаваць адкрыць рот, нахіліцца, папрысядаць і пакашляць. Такія дагляды нясуць у сабе высокую рызыку для ўзнікнення сітуацый гвалту, жорсткага абыходжання і нават катаванняў, а таксама могуць зрабіцца асновай для прымусаў, дамаганняў, дыскрымінацыі.



Таму асабістыя дагляды павінны выкарыстоўвацца толькі ў выпадках абсалютнай неабходнасці, з гарантаваннем бяспекі і захаваннем годнасці зняволеных. Аднак жанчыны распавядаюць пра нематываваныя шматлікія "голыя" дагляды, якія часам праводзяцца ў прысутнасці персаналу мужчынскага полу.

Калі мяне толькі прывезлі, адбыўся *"голы шмон"*, пры якім мужчыны-канваіры не выйшлі з пакоя. Мяне перад імі спачатку прымусілі раздзецца да майткоў, а потым і іх сцягнуць да каленаў і 10 разоў прысесці. Мяне пачало трэсці ад жаху, а гэтыя *канваіры з мяне смяяліся.* На хвіліну здалося, што я знаходжуся ў нейкім страшным сне.
Я ледзь сябе ўзяла ў рукі.

— сведчанні былой палітзняволенай Кіры Баярэнкі, СІЗА № 1

Зневажальным быў яшчэ “голы” дагляд. У многіх дзяўчынак збіваўся менструальны цыкл праз стрэс і дрэнныя ўмовы. Сваякі не маглі перадаць пракладкі, а фельчарка выдавала іх рэдка або пасылала матам на тры літары. У мяне скончыліся пракладкі падчас месячных. І вось мяне вядуць на дагляд. Я здымаю на даглядзе гэтую брудную бялізну, а мне так няёмка і непрыемна... *Гэта ўсё так зневажальна.* На мяне глядзяць, як на незразумела каго. А я ж не магу паўплываць на тое, што адбываецца: у мяне няма зменнай бялізны праз адсутнасць перадач, я не магу нічога зрабіць са сваім арганізмам, мне не выдаюць пракладкі ды іншыя сродкі гігіены. Я нават не ўпэўненая, што пры гэтым “голым” даглядзе мужчыны не прысутнічалі, бо *там былі дзверы адчыненыя.*

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці,
ІЧУ на Акрэсціна, 2024 г.

Адчыняецца кармушка — прасоўваеш рукі, на іх надзяваюць кайданкі. Адчыняюць камеру, выходзіш, цябе вядуць у закутак, дзе ты *мусіш распранацца.* Я нават паспявала падумаць: якая прыемная дзяўчына, бландзінка, такая дагледжаная — і твар, і пазногці. А потым тая ж дзяўчынка кажа: *“Ну што, шмара, распранайся. У стрынгах? А не замалыя?”*

— сведчанні былой палітзняволенай Алесі Буневіч
[Медыязона, 2024]

У звычайных зняволеных ён [вобшук] выглядаў як абмацванне і праверка металашукальнікам. У нас былі штодзённыя “голыя” вобшукі, дзе даводзілася спрачацца нават за прадметы асабістай гігіены. Калі ў кагосьці былі месячныя, трэба было *аддзіраць пракладку і паказваць, што пад ёй.*
Гэта быў акт прыніжэння.

— сведчанні былой палітзняволенай Асі Булыбенкі,
СІЗА № 1 [Салідарнасць, 2023]

# Да жанчын прымяняюць у тым ліку фізічную сілу, спецсродкі, нават электрашокер.

*Кайданкі нам надзявалі заўсёды ззаду.* На новым ІЧУ нас заўсёды вадзілі выключна “ластаўкай”. У мяне праз гэта пачаліся вельмі моцныя праблемы. У мяне быў псіхалагічны блок, я адмовілася нахіляцца і гэта прывяло да моцнага канфлікту.

— сведчанні пацярпелай на ўмовах ананімнасці,
ІЧУ г. Віцебск, 2024 г.

Калі сілавікі зайшлі ў пакой, я ляжала ў ложку *ў адных майтках*. Супрацоўнік сцягнуў з мяне коўдру, мяне білі нагамі па спіне, па ягадзіцах. Пакуль я была амаль голай, іншыя супрацоўнікі падсмейваліся і казалі: *“Што мы там не бачылі?”.*

— сведчанні былой палітзняволенай Крысціны Чаранковай
[Салідарнасць, 2024]

На судзе Наста Лойка заявіла, што падчас арышту яе двойчы адводзілі на гутаркі з супрацоўнікамі ГУБАЗіКу, дзе адзін раз яе *ўдарылі электрашокерам,* а 11 лістапада адзін з супрацоўнікаў ЦІП вывеў яе ва ўнутраны двор і пакінуў без вопраткі на восем гадзін. Наста моцна захварэла.

— сведчанні пра праваабаронцу Насту Лойку

Ставяць на расцяжку, задзіраюць рукі ў кайданках, б'юць шокерам па нагах, спачатку па адной, потым па другой. Потым проста б'юць рукамі па твары. Не моцна, але я раней не сутыкалася з гвалтам. І не супраціўляюся, проста з імі спрабую размаўляць — што здарылася і чаму мяне затрымалі.

— сведчанні былой палітзняволенай Алесі Буневіч [Медыязона, 2024]

Але супрацоўніца пачала мяне біць — схапіла за валасы і *ўдарыла аб сцяну.* Я рассекла губу, пацякла кроў. Папрасіла якую-небудзь сурвэтку, таму што кроў капала на падлогу. Супрацоўніца, якая збівала, нічога не дала. Але выйшаў нейкі мужчына і даў звычайны аркуш паперы. Я крыху выцерлася, пасля гэтага мяне пачалі афармляць.

Супрацоўніца міліцыі сарвала з мяне пантофлі, *бо яны былі ў крыві.* Мяне басанож і ў адной летняй сукенцы закінулі ў камеру. Ноч я правяла адна, але мяне пакусалі насякомыя.

— сведчанні былой палітзняволенай Алены Маўшук [Люстэрка, 2025]

# Як “выпраўляюць” жанчын у калоніях

**У Беларусі існуе дзве калоніі для жанчын:** для ўпершыню асуджаных — № 4 у Гомелі, для тых, хто раней адбываў пазбаўленне волі, — № 24 у Зарэччы.

Жанчыны жывуць у атрадах прыблізна па 80-100 чалавек, носяць аднолькавае адзенне, працуюць на швейнай фабрыцы ў дзве змены, а ў невялікую рэшту свабоднага часу абавязаныя глядзець праграмы па дзяржаўным ці ўнутраным тэлебачанні. Часу на ліставанне з блізкімі ці на іншыя асабістыя справы амаль не застаецца. Адміністрацыі установаў робяць ўсё, каб вынішчыць у жанчынах індывідуальнасць.

У калоніі створаны такія ўмовы, каб забіць у табе жанчыну, тваю прагу даглядаць за сабой, бо ўсведамленне таго, што ты добра выглядаеш, узнімае настрой, а радавацца там ты не павінен. Ты павінен быць шэрай масай, не павінен усміхацца, бо, як шмат хто з супрацоўнікаў казаў, *“у турме павінна быць голадна, холадна і сыра”, бо “зэк мусіць пакутаваць”. [...]*

Гэтыя скоцкія ўмовы — *усё гэта вельмі прадумана,* каб цалкам выбіць глебу з-пад ног, каб чалавек згубіў сваю ідэнтычнасць, зламаўся, упаў духам. Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю, каб вынішчыць думкі пра які-кольвек супраціў. Каб ты адчуваў сябе слабым, непаўнавартасным, бездапаможным, вінаватым, бо такімі людзьмі лягчэй кіраваць і маніпуляваць, іх лягчэй кантраляваць.

— сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Класкоўскай, ПК № 4

Чым ты лепшая ў калоніі — тым ты горшая. Чым больш ты магла на волі — тым менш можаш тут. Калі на волі цэніцца твая індывідуальнасць і твае адрозненні, то тут наадварот. *Там трэба зраўняць сябе з травой,* груба кажучы. Трэба стаць настолькі кругленькім, каб не было за што зачапіцца. Гэта рэальнасць той турмы, у якой я была.

— сведчанні былой палітзняволенай Яны Жураўлёвай, ПК № 4

## Згодна з Мінімальнымі правіламі, санітарныя ўстаноўкі павінны быць дастатковымі для таго, каб зняволеныя маглі задавальняць свае натуральныя патрэбы, калі ім гэта трэба, ва ўмовах чысціні і прыстойнасці (п. 15).

Аднак былыя палітзняволеныя жанчыны неаднаразова распавядалі, што сачыць за асабістай гігіенай у калоніі немагчыма: з раніцы заўсёды чарга ў прыбіральню, толькі раз на тыдзень паводле раскладу дазволена хадзіць у “лазню”, дзе на ўсё даецца 15 хвілін, дадаткова памыць валасы можна толькі яшчэ адзін раз у адмыслова прызначаны дзень.



Я часам з раніцы не паспавяла схадзіць у прыбіральню, бо ў нас было чатыры ўнітазы на 100 чалавек. І часу вельмі мала: а 6-й узнімаешся, а ў 6:25 ужо мусіш пастроіцца на сняданне. Да гэтага трэба заправіць ложак з вельмі маразматычнымі патрабаваннямі, а яшчэ ж трэба апрануцца і ў прыбіральню схадзіць, а там чарга. Усюды чэргі, і ўсе злыя з раніцы. Трапіць у прыбіральню не заўсёды атрымлівалася, і праз гэта вельмі часта балеў жывот. [...]

У атрадзе *душ адзін амаль што на 100 чалавек...* і чарга туды займаецца загадзя. І калі ты туды трапіш, то трэба ўсё вельмі хутка рабіць, а пасля на мокрае цела зноў нацягваць гэтую нязручную форму. Гэта вялікі стрэс, і цябе ўвесь час падганяюць, усе крычаць, сварацца.

Дарэчы, паводле турэмных правілаў ты не маеш права карыстацца душам у атрадзе [калі ён там ёсць] раней за 21:30, толькі калі аб'яўленая ўжо "падрыхтоўка да адбою". У 21:30 дзяжурная па ўмывальніках ужо пачынае прыбіраць душ і санвузел. Дык калі тады мыцца? На свой страх і рызыку мы мыліся ў іншы час — вольны ад працы, але за гэта можа быць рапарт. Толькі ўявіце сабе: *рапарт за тое, што ты мыешся!*

Калі ж мы працавалі ў першую змену, то ў вольны час пасля працы спрабавалі залазіць у душ. Але ў любы момант маглі прыйсці начальніцы атрадаў, кабінеты якіх месцяцца ў нашых бараках, і сарваць шторы з душавой кабінкі. І чалавек стаіць папросту аголены і мусіць *даваць тлумачэнні, чаму карыстаецца душам.*

— сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Класкоўскай, ПК № 4

У атрадзе 80 чалавек, а гэта пяць унітазаў, восем умывальнікаў і толькі адно бідэ, дзе можна зрабіць гігіенічныя справы. На месяц на чалавека выдавалі толькі адну ўпакоўку пракладак, у якой было іх 10 штук. Гэта вельмі цяжка. Трэба разумець, што звычайным асуджаным можна дзяліцца паміж сабой, асабліва калі яны супрацоўнічаюць з аператыўным аддзелам. *А калі палітычная падзеліцца пракладкай з кім, то пойдзе на камісію па пакаранні.* Але зняволеныя, якія ўтрымліваюцца даўно, казалі, што пракладкі пачалі выдаваць толькі са з'яўленнем палітзняволеных. А да гэтага часу нічога не было. Жанчыны, якія не мелі дапамогі, спраўляліся неяк сваімі сродкамі.

— сведчанні былой палітзняволенай Ірыны Шчаснай, ПК № 4

У Мінімальных правілах адзначаецца, што зняволеным варта выдаваць адзенне, якое адпавядае клімату і якое дазваляе падтрымліваць здароўе ў здавальняючым стане. Гэтае адзенне не павінна мецць ні абразлівага, ні зневажальнага характару (п. 19).

Калі жанчыны трапляюць у калонію, у іх забіраюць рэчы, у якіх яны прыехалі. Пакінуць могуць нямногае і толькі чорнага колеру, хоць у інструкцыі прапісана, што можна насіць цёмна-зялёны, цёмна-сіні і карычневы. Наўзамен даюць форменнае адзенне: ружовую сукенку, зялёны касцюм — пінжак і спадніца, сінюю целагрэйку.

Узімку зняволеныя часам замярзаюць, а ўлетку, нягледзячы на спякоту, не могуць распрануцца. У якім менавіта адзенні трэба быць, кожную раніцу аб’яўляе адміністрацыя, самім выбраць нельга. У такім адзенні, што часта не пасуе пад надвор’е, зняволеным нярэдка даводзіцца стаяць працяглы час на дварэ на пастраеннях.

Раней выдавалі хусткі, якія можна было завязаць і кутком прыкрыць шыю. Гэта дазваляла ледзь-ледзь захаваць цяпло. Цяпер пачалі выдаваць шапкі, якія называюць *“гандонкамі”*: яны прыліпаюць да галавы цалкам, у іх няма адваротаў, шыя голая, каўнер падняць немагчыма. Шыя цалкам голая. *У іх было вельмі холадна.*

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці,
ПК № 4

Было вельмі цяжка, калі *забралі практычна ўсе мае рэчы*, пакідаючы самы мінімум па спісе: некалькі пар калготак і шкарпэтак. І ўсё, што ты можаш насіць са свайго, павінна быць пад спецадзеннем з калоніі. Гэта значыць ты павінен зліцца з масай.

*Вопратку даюць чужую, жудасную, брыдкую.* Памятаю страшную целагрэйку, яна да таго ж была ў мяне патрыманая, жудасны абутак, у які немагчыма ногі ўсунуць, жудасны зялёны касцюм і недарэчную ружовую сукенку. Калі мне ўсё гэта выдалі, у мяне суткі была істэрыка.

Я сама сабе дзівілася: няўжо адзенне для мяне так шмат значыць? Здавалася, што разам з маім адзеннем забралі мяне саму. Колькі я была ў калоніі, калі глядзела ў люстэрка, мне патрабаваўся нейкі час, каб убачыць у ім сябе. Я глядзела на нейкую жанчыну, а потым разумела: *а, ну так, гэта я.*

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці,
ПК № 4 [Салідарнасць, 2023]

Абутак вельмі нязручны: грубыя чаравікі, гумовыя шлёпанцы і туфлі на плоскай падэшве, якія націраюць мазалі. Зімовыя туфлі ўнутры ніяк не ўцепленыя, таму ў іх досыць холадна.

*Абутак і адзенне могуць даць не па памеры.*
Мне далі зімовыя туфлі на некалькі памераў большыя, я надзела іх адзін раз, бо так трэба было паводле правілаў, на адно з мерапрыемстваў калоніі з удзелам адміністрацыі. На астатні час у мяне былі свае туфлі. Я хадзіла ў іх паўдня — і мне сцерла нагу. Прычым не ў наску або пятцы, а там, дзе матэрыял зверху, на ўзроўні шчыкалаткі. У мяне да гэтага часу ёсць невялікі шнар на назе ад гэтага.

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці,
ПК № 4



Калаж з фота: Пётр Вуйцік / Piotr Wójcik

Акрамя таго, усіх палітычных зняволеных адразу ставяць на прафілактычны ўлік як “схільных да экстрэмізму і іншай дэструктыўнай дзейнасці”: *яны павінны насіць нашыўкі жоўтага колеру на адзенні,* спаць толькі на другім ярусе ложкаў, тры-чатыры разы на дзень выходзіць на праверку на вуліцу пры любым надвор’і. Нават пасля прыбірання снегу ў мокрай вопратцы жанчыны мусяць стаяць каля 30 хвілінаў на марозе.

“Жоўтай катэгорыі” адразу кажуць, што будуць дзяўбаць за ўсё што заўгодна. І, натуральна, мы нічога не рабілі з таго, што нельга, таму што не хацелі ні сабе праблем, ні іншым. Гэта значыць, калі нас змясцілі ва ўмовы, *дзе мы пакутуем крыху больш,* то мы гатовыя гэта несці, абы не пакутавалі ад нас усе астатнія. У маім атрадзе была калектыўная адказнасць. Напрыклад, калі сядзіш п’еш гарбату з дзяўчаткамі-”экстрэмісткамі”, то трэба сядзець так, каб ні ў каго нават думак не ўзнікла, што мы нейкай шакаладкай можам абмяняцца. *У калоніі заўсёды прысутнічае адчуванне позірку ў спіну* — там усе агенты, усе “стукаюць”.

— сведчанні былой палітзняволенай Яны Жураўлёвай,
ПК № 4

Асобны від катаванняў у жаночай папраўчай калоніі № 4 — “клетка ганьбы”, якая размешчаная паміж жылой і вытворчай зонамі, на прыступках перад варотамі на фабрыку. Яна ўяўляе сабой прамавугольнік з металічных прутоў, даўжынёй каля паўтара метра, а шырынёй — каля двух. Жанчыны могуць знаходзіцца там ад гадзіны да трох-чатырох пры любым надвор’і.



*Там можна толькі стаяць,* у ёй няма нават крэсла, а калі сесці на зямлю, то час знаходжання ў гэтым "памяшканні" можа павялічыцца. У "клетку" ставяць пры любым надвор'і і любым настроі. Часта наўпрост *адтуль адпраўляюць адразу ў ШІЗА.*

У ёй няма дзе развярнуцца, дзясяткі людзей праходзяць міма, глядзяць на цябе і думаюць: "Што яна нарабіла?". Адміністрацыя, якая павінна "перавыхоўваць", ходзіць і кпіць.

— сведчанні былой палітзняволенай Дар'і Чульцовай, ПК № 4

Першы раз убачыла [клетку], калі толькі прыехала. Іду і ў нейкі момант разумею, што бачу чалавека ў клетцы. *Яна стаіць на ўсеагульным аглядзе.* Страшна сабе ўявіць, як гэта маральна. Звычайная металічная клетка каля будынка. Пруты пафарбаваныя ў шэры колер, дзяўчынка зусім маладая стаіць у гэтай клетцы. Гэта як наогул, гэта *ў якіх кніжках пра катаванні яны такое прачыталі?*

— сведчанні былой палітзняволенай Наталлі Кукішавай, ПК № 4 [Медыязона, 2024]

Яшчэ я ўбачыла “сярэднявечную” клетку для пакаранняў каля брамы калоніі. Невялікая, метр на два. На меркаванне адміністрацыі, у залежнасці ад ступені віны — калі яшчэ не рапарт і цябе не адпраўляюць у ШІЗА — цябе можна “правучыць у навуку астатнім”. Становішся ў гэтую *“сярэднявечную клетку ганьбы”*, і, калі атрад ідзе на фабрыку, усе глядзяць на цябе.

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці,
ПК № 4 [Медыязона, 2024]

Яшчэ адзін від пакарання для жанчын у зняволенні — змяшчэнне на працяглы тэрмін у штрафны ізалятар: халодную і вільготную камеру, без гарачай вады ў кране, без магчымасці выходзіць на прагулкі, атрымоўваць лісты і перадачы ад родных. Нават на ноч там не выдаюць матрац і коўдру, прыходзіцца спаць на драўляным ложку, які на дзень прышпільваецца да сцяны.

Пры сабе можна мець толькі туалетную паперу, зубную шчотку, пасту, ручнік і мыла. Калі мы прымаем у ШІЗА душ, а гэта раз на тыдзень, то можна папрасіць, каб з атраду прынеслі шампунь і мачалку — але гэта выдаецца толькі на час, калі ты прымаеш душ. Там нават *не было люстэрка і гарачай вады,* што рабіла немагчымымі элементарныя гігіенічныя інтымныя жаночыя працэдуры. Вельмі-вельмі рэдка, і то пасля адпаведных зваротаў, выдавалася пластыкавая бутэлька з цёплай вадой. Але гэта ўсё было вельмі нязручна і нерэгулярна.

І камеры ШІЗА *абсталяваны відэакамерамі,* і ўвесь час могуць глядзець у вочка, і ніякай асабістай прасторы. Таму, нават калі ты выпрасіш гэтую бутэльку, ты ў такім стрэсе абмываешся, што больш атрымліваеш стрэс, чым нейкія станоўчыя эмоцыі. Аднойчы я правяла запар 30 сутак у ШІЗА, і за ўвесь гэты час мне не далі расчоску для валасоў.

Пра які дагляд за сабой можна казаць, калі нават майткі ў ШІЗА ты можаш мець толькі адныя. У маім выпадку было так. І толькі калі пачаўся чарговы моцны крывацёк, мне дазволілі перадаць у камеру яшчэ адну пару ніжняй бялізны.

— сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Класкоўскай,
ПК № 4

*Абсалютна нічога няма.* Табе выдаюць нейкую такую форму, на спіне якой напісана “ШІЗА”. *Форма можа быць маленькая:* пінжак на табе не зашпільваецца, спадніца на табе, прабачце, як у пэўных катэгорыях з нізкай маральнай адказнасцю.

Яшчэ адміністрацыя можа гуляцца. Калі ў ДВП напісана, што жанчына ў ШІЗА можа знаходзіцца ў кашулі з доўгім рукавом, але на “усмотрение начальника колонии”, а ён угледзеў, што жанчына ў ШІЗА можа знаходзіцца ўвогуле ў маечцы на брэтэльках. У шмат якіх людзей гэтых маечак няма — яны проста *пінжак апранаюць на голае цела.* Калі ты сядзіш месяц, ты не можаш змяніць гэтую форму. Ты месяц сядзіш у гэтай форме. Ты ў ёй ходзіш, спіш. [...]

І добра, калі ў цябе ёсць калготкі, у якіх можна спаць. *А некаторыя спяць у абутку ўвесь час.* Адна жанчына ў боціках спала, дуцікі называюцца. Цяжка было і псіхалагічна, і фізічна вытрымліваць усе гэтыя катаванні.

— сведчанні былой палітзняволенай Паліны Шарэнды-Панасюк,
ПК № 24

# Прыцягненне жанчын да цяжкай працы

Права на ахову здароўя і бяспечныя умовы працы зняволеных замацаваныя ў Мінімальных стандартных правілах (п. 101). Аднак на практыцы, акрамя асноўнай працы на швейнай вытворчасці, зняволеныя жанчыны звычайна бясплатна прыцягваюцца да выканання работ па так званым “калектыўным самаабслугоўванні”, што ўключае ў сябе прыборку памяшканняў і тэрыторыі калоній. Таксама яны часта займаюцца разгрузкай прадуктаў для кухні, цягаюць цяжкія мяшкі з бульбай і гароднінай, разгружаюць камяні і пераносяць снег.

Зімой чысціць снег — шуфлямі ці рыдлёўкамі трэба грэбці гэты снег і закідваць у мяхі для бульбы, а потым іх трэба цягнуць у спецыяльнае месца для выкіду снегу. Гэта дурдом! Палітычных на гэты снег вызначаюць у першую чаргу. Гэта фізічна цяжка. Снег, асабліва калі мокры, то вельмі цяжкі. На руках з’яўляюцца мазалі, а сама ты вельмі моцна пацееш. Гэта не тое, што не мужчынская справа, *гэта не чалавечая справа.*

— сведчанні былой палітзняволенай Ірыны Шчаснай, ПК № 4

*У атрадзе ты так проста не сядзіш.* Цябе заўсёды накіроўваюць на прафілактычныя працы. Напрыклад, зімою я ніколі не надзявала шлёпанцы, заўсёды была ў вулічным абутку. Бо нас пастаянна ганялі на прыборку тэрыторыі: чысціць снег або прыбіраць лужыны. Калонія, напэўна, была самым чыстым месцам у Гомелі — так часта мы там прыбіралі. *Як мы прыбіралі лужыны ў калоніі?* Спачатку ты шуфлямі і венікамі зганяеш ваду ў каналізацыйны люк, які па ўзроўні знаходзіцца вышэй за лужыну. *Гэта робіцца, нават калі ідзе дождж.* Калі чакаецца буйная праверка, то трэба было дадаткова вымочваць лужы анучамі.

— сведчанні былой палітзняволенай Наталлі Кукішавай,
ПК № 4

*Працяглая праца на холадзе і ў мокрай вопратцы без магчымасці абагрэцца і пераапрануцца вядзе да хваробаў.* А згодна з беларускім заканадаўствам, жанчын нельга прыцягваць да працы, якая звязана з падыманнем і перамяшчэннем цяжкасцяў вагой больш за 10 кілаграмаў.

Узімку жанчын да або пасля працы масава прымушаюць прыбіраць снег — яго спачатку чысцяць, а потым выносяць у торбах. Калі рыдлёўкай немагчыма расчысціць снег, то яны вёдрамі носяць кіпень, растапляюць, а потым лужы зграбаюць у вёдры і выносяць. За дзень на прыбіранне снегу зняволеных могуць выклікаць нават тры разы. *Праца на дварэ ў мароз можа цягнуцца больш за гадзіну.* Але пасля гэтага ў жанчын няма магчымасці прасушыць іхныя рэчы, таму пасля чысткі снегу яны могуць увесь дзень хадзіць у мокрай вопратцы і абутку, праз што яны часта хварэюць.

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці,
ПК № 4

Усё, што пабудавана [у калоніі], пабудавана рукамі зэчак. Прыязджае машына — мужыкі яе адчыняюць і стаяць чакаюць, пакуль ты, баба, разгрузіш гэтыя камяні. *Навошта наймаць грузчыкаў, калі ёсць бабы?* Сорамна казаць, але ў мяне вылез гемарой ад гэтых цяжараў.

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці,
ПК № 4 [Медыязона, 2024]



За сваю працу зняволеныя павінны атрымліваць справядлівае ўзнагароджанне ў рамках пэўнай сістэмы. У адпаведнасці з гэтай сістэмай, зняволеныя павінны мець магчымасць расходаваць прынамсі частку заробленых імі грошай, каб набываць дазволеныя прадметы асабістага ўжытку і пасылаць частку сваіх заробкаў сям'і. (п. 76)

*Першы мой заробак — 14 капеек.* І гэта пры тым, што я атрымлівала ўвесь заробак. У мяне не было штрафаў і выплатаў. Людзі, якія плацілі штрафы, наогул заробкаў не бачылі.

— сведчанні былой палітзняволенай Аляксандры Хомчанкі, ПК № 4

Мне маглі пераводзіць грошы, таму я не асабліва глядзела ў свой разліковы рахунак [15-20 рублёў]. *Мне ўжо было проста смешна* ад таго, што за шэсць дзён на тыдзень на фабрыцы я атрымліваю гэтыя капейкі. Але ў мяне не было мэты зарабіць грошы, мне трэба было нешта рабіць. Гэта ж усё адно нейкі досвед.

— сведчанні былой палітзняволенай Яны Жураўлёвай, ПК № 4

Палітычным нельга дадаткова хадзіць на фабрыку, каб не даваць магчымасці зарабіць больш грошай. Таксама палітзняволеным нельга навучацца ў іх каледжы, дзе можна было б атрымаць спецыяльнасць швачкі, цырульніцы і іншыя. *Усе могуць атрымаць гэтую адукацыю, а палітычныя — не.*

— сведчанні былой палітзняволенай
Ірыны Шчаснай, ПК № 4

За гаспадарчыя працы *наогул не плацілі.* Праца швачкай аплачвалася. Я атрымлівала каля 100 рублёў у месяц, з якіх вылічвалі больш за 60 рублёў на апякунскія выплаты для дачкі. Былі месяцы, калі на рахунку ў мяне заставалася сем рублёў. На гэтыя грошы можна было купіць што-небудзь у турэмнай краме. *Хапала на адзін-два пачкі цыгарэт.* Калі з волі не прыходзілі грашовыя пераводы, то і атаварвацца было няма за што.

— сведчанні былой палітзняволенай
Алены Маўшук, ПК № 24 [Люстэрка, 2025]



# Жаночае здароўе за кратамі

У перыяд знаходжання ў месцах няволі фізічны і псіхічны стан жанчын пагаршаецца ў значнай ступені праз адсутнасць належнай медыцынскай дапамогі, якаснага і паўнавартаснага харчавання, невыкананне нормаў гігіены і перанаселенасць папраўчых установ.

Згодна са словамі былых палітзняволеных, у калоніі № 4 жанчынам нельга пры сабе захоўваць большасць лекаў, а медыкаменты ад хранічных захворванняў атрымліваюць ад фельчара штодзённа пасля працяглага чакання ў чарзе. Пры дрэнным самаадчуванні хутка патрапіць можна толькі да фельчара, бо да лекара складаней. Фельчар, напрыклад, можа даць таблеткі ад высокай тэмпературы, але не аказвае паўнавартаснага лекавання. Каб патрапіць да лекара і атрымаць больш сур'ёзную дапамогу, трэба пісаць адмысловую заяву і чакаць, такое чаканне можа цягнуцца і паўгода. Пералік лекаў ва ўстанове вельмі абмежаваны, таму шмат жанчын увесь час хварэюць і ў іх абвастраюцца хранічныя хваробы. Праз тое, што атрымаць бальнічны складана, зняволеныя вымушаны хворымі хадзіць на працу ды дзяжурствы.

*З медычнай дапамогай у СІЗА агромністая праблема.* Яна там не тое каб пакідае жадаць лепшага — там калі выжывеш, ужо будзе добра. Відавочна, што большасць медперсанала — гэта не лекары, а сярэдні медперсанал, фельчары. Да нас лекар прыходзіў вельмі рэдка і, каб да яго патрапіць, патрэбна была надзвычайная нагода. Медагляд праводзяць праз "кармушку", скаргі зняволеных на здароўе медперсанал не хвалююць. *Пералік лекаў вельмі маленькі, прызначаюць іх дзіўным чынам.* Напрыклад, падчас упершыню выяўленай артэрыяльнай гіпертэнзіі не прызначаюць базісную тэрапію, ніяк не карэктуюць лекаванне.

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці,
СІЗА № 1

Быў выпадак, калі ў мяне пачаўся прыступ [астмы], пайшла ў санчастку па таблетку. Разумею, калі яе не дадуць у бліжэйшы час, яна ўжо не дапаможа, спатрэбіцца ўкол. А ад яго ванітуе і моцны галаўны боль. Я ледзь дыхаю, а медык: *"Не бачу, каб вы задыхаліся"*. Кажу: "Праверце, у вас жа ёсць апарат, які вымярае кісларод. Вось мой палец". Яна праверыла, але нічога не сказала. *Напэўна, там ужо быў нейкі жах.*

— сведчанні былой палітзняволенай Дар'і Афанасьевай,
ПК № 4 [Блог "Людзі", 2024]

Згодна з Бангкокскімі правіламі, у інтарэсах жанчын-зняволеных прымаюцца прафілактычныя меры па ахове здароўя, якія маюць дачыненне непасрэдна да жаночага арганізму, такія як Пап-тэст і абследаванне на наяўнасць анкалагічных захворванняў малочнай залозы і жаночых палавых органаў (Правіла 18). Аднак на практыцы трапіць да вузкага спецыяліста можна толькі пры наяўнасці адпаведных скаргаў і праз некалькі месяцаў чакання.

У калоніі існуе *абавязковы гінекалагічны агляд,* але за тры гады я на яго трапіла толькі аднойчы. Таксама па запісы можна запісацца да гінеколага. А неяк патэлефанавалі і сказалі мне і яшчэ некалькім жанчынам ісці ў медчастку. Калі мы прыйшлі, то сказалі распранацца і даваць руку на прышчэпку. Але я заявіла, што без адпаведнага медагляду не ведаю, ці будзе мне на карысць тая прышчэпка, ці, наадварот, пашкодзіць. *Я адзіная, хто адмовілася.* Я не супраць прышчэпак, але ж гэта *мусіць быць цывільна.* Той выпадак мяне вельмі ўразіў, як па пэўным загадзе людзей без медагляду, без вымярэння ціску і тэмпературы павялі на прышчэпкі. Гэта маленькі прыклад, але паказальны.

— сведчанні былой палітзняволенай Ірыны Шчаснай, ПК № 4

Гэта як у мяне: у мяне падчас месячных, напрыклад, вельмі баліць жывот часта, ну, так, што я не магу ні стаяць, ні ляжаць, ні хадзіць, нічога. І я ў напаўсагнутым стане прыпаўзла ў гэтую санчастку па таблетку *і проста там выпрошвала.* Мне маглі яе проста не даць, але *мне пашанцавала і я засталася жывая.* Вось. Былі сітуацыі, калі і не давалі.

— сведчанні былой палітзняволенай Дар'і Чульцовай, ПК № 4



З менструацыяй можа быць так: *тры месяцы няма, а потым пяць месяцаў ідзе* не спыняючыся. І гэта досыць распаўсюджаная з’ява. Праз нервы, стаянне на холадзе ўзімку падчас праверак, плюс мы вельмі *шмат цяжараў цягаем.*

— сведчанні былой палітзняволенай Дар’і Афанасьевай, ПК № 4 [Блог “Людзі”, 2024]

Жанчыны, якія прайшлі праз зняволенне, распавядаюць, што ў іх значна пагоршыўся стан скуры, валасоў, пазногцяў. Гэта можа быць выклікана дрэнным харчаваннем і адсутнасцю вітамінаў; бесперапынным знаходжаннем у напружаным псіхалагічным стане, што з’яўляецца адной з магчымых прычынаў гарманальных парушэнняў; неналежнымі ўмовамі ўтрымання і працяглым знаходжаннем у СІЗА (кепская вентыляцыя, перапады тэмператур, высокая вільготнасць ці, наадварот, сухое паветра).

Праз адсутнасць збалансаванага харчавання, недахоп вітамінаў, а таксама хранічны стрэс, валасы робяцца ломкімі і тусклымі. *Шмат у каго валасы пачынаюць выпадаць.* На так званую лазню, што раз на тыдзень, даецца катастрафічна мала часу — каля 15 хвілінаў, а за гэты час трэба ж яшчэ паспець распрануцца і апрануцца. Добра памыцца не паспяваеш. *Проста размазваеш па сабе бруд,* так бы мовіць. Шампунь не вымываецца. І на стане валасоў усе гэта вельмі адбіваецца. [...]

І гэта, канешне, здзек — не даваць памыць валасы жанчыне. І ўвогуле мажлівасці нармальна памыцца. Мы ж амаль ўвесь час у галаўным ўборы, галава пацее, асабліва летам. Галава ўвесь час чэшацца, валасы ўвесь час забруджаныя, з'яўляецца перхаць.

— сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Класкоўскай, ПК № 4

Мне было складана бачыць, што *я пасівела:* дагэтуль ніколі не было такой колькасці сівых валасоў, як стала ў калоніі. Праз пяць месяцаў *я глядзела ў люстэрка і не магла сябе пазнаць.*

Уявіце: ты ведаеш сябе як аднаго чалавека, а потым *бачыш зусім іншага — чалавека,* які схуднеў на дзесяць кілаграмаў, сівога ды з асунутым тварам. Мне здаецца, што на жанчын гэта псіхалагічна ўплывае, бо мы прызвычаіліся фіксаваць усе, нават нязначныя, змены ў сваёй знешнасці.

— сведчанні былой палітзняволенай
Аланы Гебрэмарыям, ПК № 4 [Люстэрка, 2025]

# Псіхалагічныя праблемы

На палітычных зняволеных увесь час ціснуць псіхалагічна. Для гэтага адміністрацыя выкарыстоўвае разнастайныя тактыкі: абразы, запужванні, прымус да прызнання віны, ліквідацыя лістоў ад родных на вачах жанчын, пазбаўленне спатканняў з блізкімі за некалькі дзён да яго праз якую-небудзь “правіну”, пагрозы падаўжэннем тэрміну зняволення, стварэнне атмасферы канфлікту і недаверу паміж зняволенымі. Праз гэта жанчыны адчуваюць сябе ў бесперапынным напружанні і стрэсе, што ў выніку прыводзіць да посттраўматычнага разладу і іншых псіхалагічных праблем.

Падобна, нас вырашылі зусім звесці са свету. Прычым, відаць, у імкненні адрэагаваць на міжнародную крытыку ўмоў утрымання ў беларускіх турмах. [...]

*У турме бясконцыя праверкі.* На практыцы гэта азначае, што мы ўвесь час у чаканні, падчас якога немагчыма сушыцца і сціracца, есці і чытаць, гуляць і нават хадзіць у туалет, усе рэчы павінны быць схаваныя, і камера павінна рабіць ўражанне нежылой.

— сведчанні палітзняволенай Валерыі Касцюговай

Самым складаным у зняволенні было тое, што амаль *штодня тваю чалавечую годнасць топчуць у бруд*. Гэта пастаянныя прыніжэнні, запалохванні і ціск. Напрыклад, я проста іду па калоніі, а супрацоўнік можа сказаць: *“О, здрадніца ідзе!”* Магчыма, гэта дробязь. Але калі гэтыя дробязі накладаюцца адна на адну, то робіцца немагчымым.

— сведчанні былой палітзняволенай Ірыны Шчаснай

Аператыўны супрацоўнік вымотваў прызнанне віны. [...] Мяне, напрыклад, *шантажавалі і пагражалі.* Я доўга супраціўлялася, але потым сталі ціснуць яшчэ мацней, і я падпісала.

*Зрабіць гэта было цяжка, вельмі цяжка.* У зняволенні я старалася трымацца і вельмі мала плакала, бо гонар не дазваляў плакаць перад імі. Але некалькі момантаў усё ж было. Калі мяне вымусілі падпісаць прызнанне віны, *я была цалкам зламаная.* Мне было жудасна сорамна і балюча.

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці [Салідарнасць, 2023]

Адразу я не плакала [пасля вызвалення]. Усе родныя плакалі, абдымалі мяне, *а ў мяне не было слёз.* Калі засталася сама — раўла. У мяне ў галаве не 2024 — там 2020. У мяне няма адчування, што гэтая бясконцасць, праведзеная там, сціснулася ў нейкую прастору і час. *Як быццам тыдзень таму сышла і вось вярнулася.*

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці [Медыязона, 2024]

Знаходжанне ў калоніі ўздзейнічае псіхалагічна і таму, што там ты не адчуваеш сваю індывідуальнасць. Ты ходзіш у страі, дзе з табой яшчэ сто чалавек, і ты бачыш адны і тыя ж твары. З гадамі зняволеныя рэальна становяцца падобнымі адна на другую. Мала хто фарбуецца дэкаратыўнай касметыкай, усе носяць адны і тыя ж сінія целагрэйкі, зялёныя спадніцы, чорны, як армейскі, абутак.

Выглядае ўсё настолькі аднатыпна, што мне, калі я там стаяла і глядзела на ўсіх гэтых жанчын, рабілася страшна. Я насамрэч баялася згубіць сябе, таму што бачыла, як працэс ужо ідзе з астатнімі. *Людзей прымушаюць не вылучацца,* і нам пастаянна закідвалі думку, што “нармальныя” жанчыны ў калоніі не сядзяць, таму *мы нават не жанчыны, а жывёлы.*

— сведчанні былой палітзняволенай Аланы Гебрэмарыям
[Люстэрка, 2025]

*Я нюхала печыва і грызла яго паволі.* Мне здаецца, у гэты момант у мяне дах і паехаў... Я хадзіла і мычала песню Надзі [Калач] “Зорамі”, якая тады яшчэ не выйшла.

Я спрабавала пераканаць сябе, што выйду заўтра. *Таму што іншыя думкі мяне разрывалі.*

— сведчанні былой палітзняволенай Асі Булыбенкі
[Салідарнасць, 2023]

Але цяжэй за ўсё мне было маральна.
У калоніі ты наогул сабе не належыш. Галоўная задача супрацоўнікаў — *вытруціць з цябе ўсё чалавечнае.* Калі хочаш там сябраваць — не-не, мы зробім з вас ворагаў. Калі хочаш дзяліцца — не, мы цябе пакараем. *Любую праяву самастойнасці спрабавалі задушыць.*

— сведчанні былой палітзняволенай Крысціны Чаранковай
[Салідарнасць, 2023]

# Разлучэнне маці і дзіцяці ў выніку палітычна матываванага пераследу

Згодна з Бангкокскімі правіламі, кантакты жанчын-зняволеных з іх сем'ямі, у тым ліку іх дзецьмі, ухваляюцца і заахвочваюцца ўсімі разумнымі спосабамі (Правіла 26), а спатканні з удзелам дзяцей праходзяць у абстаноўцы, якая спрыяе атрыманню станоўчага вопыту ад наведвання, і дапускаюць наладжванне непасрэднага кантакту паміж маці і дзіцём (Правіла 28).

Аднак у якасці дадатковага спосабу палітычна матываванага ціску беларускі рэжым актыўна выкарыстоўвае практыку разлучэння маці і дзяцей. Жанчыны, якія ўтрымліваюцца пад вартай ці ў калоніі, пазбаўляюцца магчымасці падтрымліваць рэгулярныя кантакты са сваімі дзецьмі. Прадстаўнікі ўлады нярэдка выкарыстоўваюць дзяцей як дадатковы спосаб уздзеяння на жанчын. Пасля працяглага зняволення жанчынам, апроч усяго, трэба нанова выбудоўваць сувязь са сваімі сынамі і дочкамі.

Акрамя гэтага, Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці гарантуе дзецям права не разлучацца з бацькамі без дастатковых юрыдычных падстаў і патрабуе ад дзяржаў забеспячэння лепшых інтарэсаў дзіцяці. Разлучэнне з маці, якая з’яўляецца палітычнай зняволенай, ставіць дзіця ў сітуацыю стрэсу, псіхалагічнай траўмы і пагрозы для яго нармальнага развіцця.

Самы горшы дзень быў 14 кастрычніка — Дзень маці. Нам уключылі радыё, дзе дзеці віншавалі сваіх мам са святам. *Мы вельмі моцна плакалі,* бо ў большасці з нас былі дзеці, з якімі мы не маглі быць у той дзень.

— сведчанні былой палітзняволенай на ўмовах ананімнасці

> *Мяне часта шантажавалі дзецьмі.* Як толькі муж з’ехаў, на бабулю і дзядулю афармілі апеку над дзецьмі, а я абавязаная была выплачваць дапамогу на іх утрыманне. Ва ўмовах турмы гэта было проста немагчыма зрабіць. На мяне накладвалі яшчэ больш жорсткія абмежаванні па перадачах, пакупках.
>
> — сведчанні былой палітзняволенай Паліны Шарэнды-Панасюк [Deutsche Welle, 2025]

> Пішаш [лісты], і думкі ў галаве круцяцца: а хто ім там будзе дарыць падарункі, хто іх расчэсвае, *хто ім стрыжэ ногцікі,* такія простыя рэчы, якіх ты наогул не заўважаеш, пакуль ты побач з дзецьмі.
>
> — сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Такарчук [Медыязона, 2024]

> *Мы з сынам да дня, калі мяне затрымалі, былі вельмі блізкія. І* калі гэта ўсё так брутальна прарвалася, калі на яго вачах мяне забралі, я вельмі перажывала і сумавала. У першы час *я не магла прымаць думку,* што мы нейкі час не пабачымся з сынам. Але праз час прыйшло ўсведамленне, што гэта ўжо вялікі чалавек. Калі ў калоніі былі відэазванкі, то я заўважала, што ён крыху ад мяне абмежаваўся, у яго асабістае цяпер жыццё. Я гэта ўсё разумею. Цяпер мы неяк адбудоўваем нашыя адносіны, хоць усё не так файна, як сабе ўяўлялася і як хацелася. <...> Разумею, што калі я тут і з’явілася, то нельга ламаць яго звыклы свет, да якога ён прызвычаіўся за гэтыя [амаль чатыры] гады. Таму раблю гэта ўсё асцярожна і акуратна.
>
> — сведчанні былой палітзняволенай Ірыны Шчаснай

Я не магу кантакт з імі наладзіць пакуль што. Таму што яны такога павароту не чакалі [прымусовую эміграцыю маці пасля памілавання], спадзяваліся ўбачыць мяне дома. *Дзеці сказалі, што я здраднік. Здрадзіла ім.*

— сведчанні былой палітзняволенай Алены Маўшук [Люстэрка, 2025]



З аднаго боку, усё было нармальна, мы як быццам і не расставаліся. А з іншага, *трэба было зноўку з ёй знаёміцца.* Вось яна накшталт любіла ружовы колер — а цяпер ужо не любіць. Ну і вырасла яна за два гады, ёй ужо дзевяць, яна ўжо амаль падлетак.

— сведчанні былой палітзняволенай Вольгі Філатчанкавай [Медыязона, 2024]

# Высновы




Як можна пабачыць на падставе сведчанняў, беларускі рэжым не толькі не выконвае міжнародныя стандарты і нормы, але і робіць усё магчымае, каб прынізіць годнасць жанчын праз розныя віды жорсткага абыходжання і катаванні. Дзеля гэтага ва ўсіх месцах зняволення — пачынаючы ад ізалятараў часовага ўтрымання і сканчваючы камерамі ШІЗА ў калоніях — ствараюцца невыносныя ўмовы адбывання прызначанага судом пакарання па палітычна матываваных адміністрацыйных і крымінальных справах.

Гэта падрывае як фізічнае, так і ментальнае здароўе жанчын, на аднаўленне якога можа спатрэбіцца працяглы час.

Таму мы лічым, што сёння важна аказваць комплексную дапамогу і ўсебаковую падтрымку пацярпелым ад дзеянняў нелегітымных уладаў, збіраць сведчанні і дакументаваць злачынствы рэжыму, каб у будучыні прыцягнуць да адказнасці ўсіх датычных да рэпрэсій. Мы па-ранейшаму патрабуем неадкладнага і безумоўнага вызвалення ўсіх бязвінна пакараных і затрыманых паводле палітычных матываў, а да той пары - важна шукаць спосабы, каб палепшыць становішча палітзняволеных жанчын.

У сітуацыі, калі Беларусь дэнансавала першы Факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і беларускі больш не могуць накіроўваць індывідуальныя звароты ў Камітэт пра правах чалавека ААН, адзіным інструментам абароны на міжнародным узроўні застаецца зварот у Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын.

На момант публікацыі гэтага агляду Камітэт у сваіх Заключных заўвагах выказаў сур’езную занепакоенасць становішчам жанчын у зняволенні і настойліва рэкамендаваў Беларусі прывесці ўмовы ўтрымання жанчын у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі, адмяніць дагляды з распрананнем у прысутнасці супрацоўнікаў супрацьлеглага полу, забараніць усе формы зневажальнага годнасць абыходжання, адмяніць прымусовую працу як від крымінальнага пакарання, а таксама перагледзець крымінальныя справы і вызваліць усіх жанчын, пазбаўленне волі якіх уяўляе непасрэдную пагрозу іх здароўю або жыццю, паводле гуманітарных меркаванняў.